Караева С.А., студ. гр. 313 ФТБК і СМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Васюк Т.І., дацэнт

# АКТУАЛЬНАСЦЬ ВЫКАРЫСТАННЯ ТРАДЫЦЫЙНАГА ДЭКОРУ Ў СУЧАСНАЙ МАСТАЦКАЙ КЕРАМІЦЫ

(На прыкладзе вынікаў Міжнароднага плэнэра па кераміцы "АРТ-Жыжаль")

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чалавек валодае ўменнем сачыць за з'явамі і змяненнямі прыроды, бачыць і інтэрпрэтаваць знакі і сімвалы. Кераміка, разам з іншымі відамі мастацтваў, дала яму прастору для ўвасаблення свайго светапогляду ў матэрыяле. Адным са сродкаў перадачы вобразнасці ў кераміцы стаў дэкор.

Неалітычны чалавек пачаў аздабляць прадметы свайго побыту, у тым ліку, гліняны гаспадарчы посуд, які быў вядомы з эпохі неаліту (IV-III тысячагоддзі да н.э.). Шырокія вострадонныя ляпныя гаршкі ўпрыгожваліся паясным грабеньчата-накольчатым арнаментам, які складаўся з ямак, рысак і наколаў. Такі дэкор передаваў светапогляд і ўяўленні тагачаснага чалавека і надаваў вырабу выразнасць і дэкаратыўнасць [5, с. 95]. Гэта стала момантам зараджэння дэкору керамічных вырабаў .

З тых часоў і форма ганчарных вырабаў, і іх дэкор не раз трансфармаваліся, удакладняліся і ўдасканальваліся. Паступова форма ганчарных вырабаў ускладнілася, а дэкор наадварот спрасціўся. Замест ручной лепкі выкарыстоўвалася фармоўка з дапамогай ганчарнага кола, якая надавала вырабу сіметрыю і дакладнасць. Дэкор меў прызначэнне падкрэсліваць форму вырабу, таму ім запаўнялі месцы пераходу частак выраба адна ў адну ці самае шырокае месца тулава.

Разам з тым, ганчары выкарыстоўвалі шматлікія тэхнікі дэкору і ўшчыльнення чарапка. Беларускія ганчары прымянялі абварванне (гартаванне), задымліванне і паліванне (глазураванне).

Абварванне посуду рабілі ў водным растворы жытняй мукі (на Падняпроўі — з дабаўкай ільняной ці канаплянай трасты, драўніннага вугалю, сажы), куды апускалі распаленыя ў горне пасудзіны. Ад такой

апрацоўкі посуд станавіўся моцным («звінеў») і пры гэтым пакрываўся прыгожымі чорнакарычневымі плямамі ўнутры і звонку, таму ў народзе яго звалі рабым. Абварванне ў XIX—XX стст. было пашырана амаль ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, акрамя Палесся. У іншых ганчарных цэнтрах Беларусі абварванне прымянялася паралельна з іншымі спосабамі апрацоўкі, пераважна для пячнога посуду [3].

Такой жа старажытнасцю і пашыранасцю вызначаецца і задымліванне. На Беларусі яно вядома з часоў сярэднявечча, у XIX — 1-й палове XX ст. было пашырана па ўсёй яе тэрыторыі і прымянялася пераважна для вытворчасці пячнога посуду. Сутнасць задымлівання заключаецца ў тым, што пры абпальванні посуду без доступу паветра ў выніку пэўных хімічных рэакцый паміж вокісам вугляроду (чадным газам) і солямі жалеза, якія ёсць у гліне, чарапок афарбоўваецца ў матавачорны ці сіняваты колер. Пры гэтым, як і ў працэсеабварвання, зніжаецца порыстасць чарапка, посуд становіцца мацнейшым. Задымліванне рабілі ў тых жа горнах ці печах, якія перад заканчэннем абпалу наглуха закрывалі, папярэдне падкінуўшы туды смалякоў.

У некаторых ганчарных цэнтрах паўднёвазаходняй часткі Беларусі (Пружаны, Ружаны, Пагост-Загародскі Брэсцкай вобл., Поразава, Мір Гродзенскай вобл.) задымліванне спалучалася з глянцаваннем — механічнай арнаментальнай ці суцэльнай апрацоўкай паверхні посуду перад яго абпалам. Ужывалі для гэтагагладкі крэмень, якім на падсушанай пасудзіне наводзілі разнастайныя ўзоры ў выглядзе вертыкальных палос, косай сеткі, завіткоў і інш. Пасля абпалу яны станавіліся бліскучыя, нібы металічныя, эфектна выдзяляючыся на матавачорнай ці сіняватай паверхні посуду. У Пагосце-Загародскім рабілі суцэльнае глянцаванне, посуд нагадваў металічнае ліццё.

Посуд, не прызначаны для печы, часцей за ўсё глазуравалі (палівалі) — пакрывалі яго паверхню тонкім шклопадобным слоем. Асновай палівы быў перапалены ў парашок свінец, якім пасыпалі змазаны дзёгцем посуд (Падняпроўе) ці аблівалі яго сценкі растворам парашку ў вадзе. Пры абпале

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ён плавіўся, укрываючы паверхню бліскучым воданепранікальным слоем.Дабаўка ў паліву вокісу медзі ці жалезнага перагару (дзындры) надавала ёй зялёны ці карычневы колер [3, с. 17,50].

Вадкая гліна, якую выкарыстоўвалі для роспісу вырабаў называецца ангоб. Ангобны роспіс быў распаўсюджаны па ўсіх рэгіёнах Беларусі, самымі буйнымі цэнтрамі з’яўляліся в.Гарадная Столінскага раёна, Мір Карэліцкага раёна, Бабінавічы Лёзненскага раёна, Ракаў і Івянец Валожынскага раёна і інш. Роспіс рабіўся белым ангобам па чырвонай гліне і наадварот, ён меў пасны, арнаментальны ці свободны малюнак.

Івянецкія майстры выкарыстоўвалі тэхніку фляндроўкі. Фляндроўка ўтваралася спалучэннем двух каляровых палос, якія расчэсваліся зверху ўніз, утвараючы зубчыкі. Выраб меў некалькі такіх паяскоў, якія падкрэслівалі яго форму і сіметрыю [5, с. 113-117].

Часам вырабы абплятали бярэстай ці дротам. Такі дэкор уяўляў сувязь двух прынцыпова розных матэрыялаў і , акрамя дэкаратыўнай, меў ахоўную функцыю.Пазней майстры сталі выкарыстоўваць вашчэнне, якое надае чарапку больш цёмную і матавую паверхню.

Акрамя ганчарных вырабаў шырока пашырана была дробная пластыка. Фігуркі птушак, жывёл, чалавека былі распаўсюджаны на тэрыторыі Беларусі. Яны абпрацоўваліся ўсімі тэхнікамі дэкору , якія надавалі дробнай пластыцы больш выразнасці [5, с. 125].

Майстры шукалі разнастайнасці ў формах і дэкараванні , імкнуліся да лаканічнасці і зручнасці выраба паводле яго прызначэння.

У наш час мастакі-керамісты імкнуцца перадаць ў матэрыяле мастацкі вобраз , ўвасобіць непаўторную, арыгінальную ідэю. Таму мастацкія аб’екты страчваюць сіметрычнасць і набываюць ассіметрычныя формы, часам вельмі складаныя ці наадварот надта лаканічныя і геаметрычна-стылізаваныя. Мастацкі вобраз і ідэя вызначае тэхніку і прыёмы дэкору, які распрацоўвае мастак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасныя прыёмы дэкору досыць разнастайныя: акрамя традыцыйных спосабаў апроцоўкі існуе вялікая колькасць новых, часам запазычаных і інтэрпрэтаваных тэхнік. Самым прывабным для майстроў з'яўляецца прыём гартавання (абвары): ён вельмі ўдала спалучаецца не толькі з ганчарнымі формамі, але і са стылізаванымі ляпнымі і ганчарнымі біяформамі. Абварная кераміка шырока прадстаўлена на выніковых выставах "Кола агню" мінароднага плэнэру "АРТ-ЖЫЖАЛЬ", які праводзіцца штогод ў г.Бабруйску керамістам, членам Беларускага саюза мастакоў Валерыем Калтыгіным. Кераміка пленэраў своеасаблівая, яна канцэнтруе ў сабе аўру калектыўнай агульнасці, сумеснай працы, адзінства імкненняў, шлях эксперыментаў, стварае асаблівы стан творчасці ў мастакоў. Галоўным дасягненнем пленэраў можна лічыць тое, што была сур'ёзна прапрацавана магчымасць выкарыстання беларускай народнай традыцыйнай тэхналогіі абварнай керамікі ў выкананні высокамастацкіх аўтарскіх вырабаў прафесійнымі керамістамі. На выставе па выніках апошніх плэнэраў адметнымі ў тэхніцы абварной керамікі сталі працы такіх беларускіх майстроў, як Анатоль Концуб, Тамара Васюк, І. Шчасная, Яўген Адзіночанка, Валерый і Максім Калтыгіны, Алег Ткачоў, Леанід Рыжкоўскі, Вольга Сямашка і інш [1,2].

Акрамя абварной керамікі шырока прадстаўлены працы ў тэхніцы дымлення, глазуравання, керамікі-раку (ручная фармоўкаі, нізкая тэмпература абпалу, свінцовая паліва), ангабіравання, багата выкарыстаны прыёмы рэдукцыі (аднаўленне), мазаікі з каляровых керамічных мас, маёлікі (глухая каляровая паліва), кракле па эмалі, соляў, вокіслаў, аксідаў і інш. Паводле задумкі, аўтары выкарыстоўваюць у кераміцы такія дапаўняльныя матэрыялы, як каляровае шкло, дрэва, метал, тэкстыль, у некаторых выпадках нават такі традыцыйны матэрыял, як салома. У выніку атрымліваюцца вельмі цікавыя і выразныя аб'екты, якія падкрэсліваюць узаемасувязь матэрыялаў і разнастайных станаў у навакольным свеце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод мастакоў шырока распаўсюджана тэхніка глазуравання, якая адрозніваецца ад традыцыйнай. Яе адметныя рысы: багацце колеру, жывапіснасць, дынаміка, выразнасць. Яны дасягаюцца спосабамі набрызгвання, зацёкаў, тампавання, мрамарызацыі, раздування, роспісу пэндзлем ці грушай. Колер стаў адным з галоўных выразных сродкаў у мастацкай кераміцы. Паліва адразу задае настрой творчай працы, перадае насычанасць мастацкай думкі. На выставе "АРТ-Жыжаля" 2011 ў гэтай тэхніцы вылучаюцца працы Анатоля Концуба, Рамана Чыгірава, Алега Ткачова, Антона Ціханаўца і інш.

Іннавацыйнай тэхнікай стала мазаіка, выкананая з каляровых мас. Гэта даволі складаны і працаёмкі працэс, які ўяўляюць сабой складванне пластоў рознакаляровых глін. Адметнымі ў тэхніцы мазаікі на І-ым трыенале дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і плаката былі працы керамістаў Я. Адзіночанка і Ірыны Радкевіч , якія занялі ў намінацыі "кераміка" першае і другое месцы адпаведна.

Такім чынам, беларуская кераміка XXI стагоддзя спалучае ў сабе традыцыі і сучасныя тэхнікі, дакладней, сучасныя тэхнікі грунтуюцца на традыцыйных, дапаўняюць іх. Гледзячы на сучаснае імкненне да архаікі (форм , дэкору), на зацікаўленасць традыцыйным мастацтвам, можна разлічваць на захаванне традыцыі ў сучаснасці.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Васюк, Т. І зноў – Арт-Жыжаль / Т. Васюк // Мастацтва. – 2008. – № 6. – С. 9.

2. Калтыгін, В. Чароўнае кола агню / В. Калтыгін // Культура. – 2003. – 13 снеж. – С. 9.

3. Милюченков, С.А. Белорусское народное гончарство / С.А. Милюченков ; Акад. наук БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск : Наука и техника, 1984. – 183с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі / Я.М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1997. – 287 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ